**Бабосаў Я.М.**, *прафесар*

# САЦЫЯЛІЗАЦЫЯ АСОБЫ ПРАЗ СФЕРУ КУЛЬТУРЫ

Ва ўмовах глыбокай трансфармацыі сучаснага беларускага грамадства і звязанага з ім змянення акцэнтаў у дынамічнай сістэме каштоўнасцей узнікае шмат складаных праблем, звязаных з сацыялізацыей асобы. Пад сацыялізацыей, у яе сучасным сэнсе, разумеюць працэс засваення індывідам на працягу яго жыцця сацыяльных нормаў, ідэалаў і культурных каштоўнасцей таго грамадства, у якім ён фарміруецца ў сумеснай дзейнасці і сувязі з іншымі людзьмі ў якасці асобы. Таму ў апошнія гады пры захаванні вялікага значэння ў гэтым працэсе біялагічнага і фізічнага развіцця чалавека, сацыяльных удзеянняў бацькоў і сваякоў, іншых фактараў (дзіцячы садок, кампанія равеснікаў, школа і г.д.) ўсё больш акцэнт робіцца на павышэнні ролі культуры, асабліва мастацкай, у фарміраванні асобы.

Фактычна такія акцэнты, але ў агульнафіласофскім, рэлігійным, маральным сэнсе спарадычна ўзнікалі яшчэ ў тыя часы, калі канцэпцыя сацыялізацыі асобы намаганнямі Г.Тарда і іншых сацыёлагаў толькі яшчэ фарміравалася. Найбольш рэльефнае іх увасабленне мы знаходзім у філасофска-мастацкай канцэпцыі Ул.Салаўёва, Ф.Дастаеўскага, сутнасць якой цудоўна адлюстравана ў славутым афарызме: «Прыгажосць выратуе свет». Большасць сучасных філосафаў, эстэтыкаў, культуролагаў вылучаюць у гэтым афарызме ў якасці націскнога слова першае, а яго аўтар (Дастаеўскі) і натхнены тлумачальнік (Салаўёў) канцэнтравалі ўвагу на другім, падкрэсліваючы актыўна пераўтвараючую ролю прыгажосці ў выратаванні свету. Салаўёў, дарэчы, ва ўсіх сваіх творах, прысвечаных паглыбленаму аналізу значнасці культуры, галоўным чынам такіх яс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

важнейшых камнанентаў, як маральнасць, рэлігія, мастацтва і філасофія, зыходзіў з арганічнага адзінства прыгажосці, ісціны і дабра. Ён справядліва падкрэсліваў, што толькі ў такім узамадзеянні прыгажосць пераўтварае чалавека, духоўна ачышчае і ўзвышае яго, напаўняе глыбокім духоўным сэнсам яго штодзённае існаванне. Толькі ў такім адзінстве яна злучаецца з хрысціянскай эсхаталагічнай ідэяй выратавання і становіцца важнейшым фактарам выратавання чалавека і свету.

Зыходзячы з тых самых прынцыпаў, Ф.Дастаеўскі ў сваіх геніяльных прадбачлівых раманах і ў славутым «Дзённіку пісьменніка» раскрыў глыбінную значнасць выратавальнай ролі прыгажосці ў станаўленні чалавека ў двух яе асноўных кроках. Першы такі крок культуры насустрач чалавеку — фарміраванне з кожнага індывіда сапраўднага «Я», таму што немагчыма стаць нікім, калі не стаў перш за ўсе самім сабой.

А другі, яшчэ больш важны,— фарміраванне ў чалавеку адносін да другога чалавека як да самога сябе. Гэтыя два крокі культуры, у якіх спалучаюцца прыгажосць, дабро і ісціна, выратуюць чалавека ад спакусы самазадаволенасці, саманадзейнасці, індывідуалізму, зробяць яго адухоўленай асобай, якая маральна ачышчае сябе і іншых людзей.

Глыбінны гуманістычны сэнс дактрыны Салаўёва-Дастаеўскага аб чалавекастваральнай сутнасці культуры знайшоў практычнае ўвасабленне ў сацыяльна-псіхалагічнай канцэпцыі «культурнага дэтэрмінізму», усебакова распрацаванай у 30-70-х гг. XX стагоддзя вядомымі амерыканскімі сацыёлагамі Ф.Боазам, Р.Бенедзіктам і М.Мід. Галоўны прынцып гэтай канцэпцыі абвяшчае: чалавечая прырода бясконца пластычная, пагэтаму культурныя фактары здольныя фарміраваць любы тып чалавечай асобы і любыя мадэлі сацыяльных роляў у паводзінах людзей. Па сцвярджэнню Бенедзікта, «культура — гэта прадпісанне асобы», а згодна з Мід, «культура — гэта крыніца асобы».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фактычна ў гэтым жа накірунку развіваў ідэі аб рашаючай ролі культуры ў сацыялізацыі асобы адзін з класікаў сацыялогіі, прафесар Толкат Парсанс (1902-1979 гг.). З яго пункту гледжання, чалавечая асоба амаль што такая ж складаная сістэма, як і грамадства, толькі значна меншая па маштабе.

У сістэме асобы існуюць дзве карэнныя асаблівасці: па-першае, сімвалічнасць, г.зн. наяўнасць такіх сацыяльных механізмаў рэгуляцыі паводзін, як мова, культурныя каштоўнасці, рэлігійныя ідэі і інш., па-другое, нарматыўнасць, г.зн. залежнасць індывідуальных дзеянняў асобы ад агульнапрынятых у грамадстве правіл, нормаў, прадпісанняў, якія зноў-такі фарміруюцца развіццём культуры. Зыходзячы з гэтага сацыялізацыю неабходна разумець як працэс «убірання» у сябе індывідам, г.зн. «інтэрналізацыю» ім культурных каштоўнасцей ва ўзаемадзеянні са «значнымі іншымі», з прычыны чаго агульназначымыя нормы і стандарты культуры становяцца вельмі важнай часткай матывацыйнай структуры асобы, рэгулятарам яе дзеянняў.

У кібернетычным сэнсе, лічыў Т.Парсанс, культурная сістэма займае найбольш высокае і важнае месца ў складанай іерархіі сістэм чалавечай дзейнасці: сацыяльная сістэма, сістэма асобы, сістэма арганізма. Менавіта жа праз мову, духоўныя каштоўнасці, узоры сімвалічнага ўвасаблення пачуццяў («экспрэсіўны сімвалізм») і іншыя формы сістэма культуры карэкціруе і рэгулюе развіццё і сацыяльнай сістэмы, і сістэмы асобы, і нават (праз дзве папярэднія) развіццё чалавечага арганізма. Таму яна адыгрывае рашаючую ролю ў сацыялізацыі асобы, яе культурным станаўленні і развіцці.

З пазіцыі якіх бы дактрын (культурнай, філасофскай ці сацыялагічнай) мы ні зыходзілі, бясспрэчным з'яўляецца факт, што сапраўднае духоўнае багацце ствараецца народам, а пісьменнік, мастак, кампазітар могуць яго ўспрыняць, выразіць у канцэнтраванай, тыпізаванай форме, толькі засвойваючы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіваючы сваім талентам народную культуру, карыстаючыся багаццем роднай мовы.

Аднак іменна гэты бок развіцця культуры ў найбольшай ступені ігнараваўся ва ўмовах непадзельнага панавання таталітарнай ідэалогіі і палітыкі. Прычым найбольшая страта была нанесена развіццю тых нацыянальных моў і культур, якія генетычна былі самымі блізкімі рускай мове,— беларускай і ўкраінскай. Гэтая страта была настолькі маштабнай, што адным з рашаючых фактараў, дэтэрмінуючых яе, стаў генацыд у адносінах да вышэйшага слоя нацыянальнай інтэлігенцыі, тых людзей, якія з'яўляюцца ініцыятарамі і рухавікамі нацыянальнага культурнага развіцця.

Нельга, нарэшце, не ўлічваць і дзяржаўнай дыскрымінацыі ў адносінах да выдання літаратуры на нацыянальных мовах ва ўмовах панавання нацыянальна-культурнага прыгнёту. У Расійскай Федэрацыі ў 1959 г. тыраж кніг на мове тытульнай нацыі ў разліку на аднаго чалавека склаў 8,3; у 1979 — 10,6; у 1989 — 12,3 кнігі, а ў Беларусі ў тыя ж гады адпаведна -- 1,2; 0,9; 0,7. Гэта значыць, што ў перыяд скону гарбачоўскай «перабудовы» і напярэдадні абвяшчэння дзяржаўнай незалежнасці Беларусі на аднаго беларуса прыпадала кніг на роднай мове амаль што ў 18 разоў менш, чым на аднаго рускага.

Безумоўна, сукупнае дзеянне названых фактараў не магло не адбіцца на сацыялізацыі і ідэнтыфікацыі асобы ў 30-80-я гады XX стагоддзя ў Беларусі. Успомнім, якая вялікая колькасць нашых грамадзян у пярыяд перапісу насельніцтва дэкларавала, што па нацыянальнасці яны беларусы, а родная мова ў іх — руская. Гэтыя перакосы з сацыялізацыяй не пераадолены і зараз. Амаль 40% апытаных беларусаў аддаюць перавагу творам беларускім пісьменнікаў (В.Быкава, І.Шамякіна і інш.) у перакладзе на рускую мову. Калі сярод рускіх асноўным крытэрыем нацыянальнай ідэнтыфікацыі прызнаюць свабоднае валоданне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роднай мовай 66,3% апытаных (даследаванні 1966г.), то сярод беларусаў — толькі 48,4%.

Прыведзеныя сацыяльныя працэсы (а іх пералік можна прадоўжыць) істотна ўскладняюць сацыялізацыю асобы, асабліва ў плане ўдзеяння на яе нацыянальнай культуры. Апроч таго, сацыялізацыя цяпер праходзіць ва ўмовах глыбокага эканамічнага, палітычнага і сацыякультурнага крызісу, глыбокай трансфармацыі сучаснага беларускага грамадства. Трансфармацыя выклікае глыбокія змяненні ўнутранага свету чалавека, яго сацыякультурных пазіцый, пераваг, арыентацый. Гэта вядзе да інверсійных змен у працэсе сацыялізацыі і сацыяльна-культурнай ідэнтыфікацыі асобы. Усё большую ролю тут пачынаюць адыгрываць два моцныя фактары, найбольш устойлівыя да ўплыву знешніх перамен,— рэлігія і этнас. Ва ўмовах, калі разбураецца былая парадыгма каштоўнасцей, калі шмат каштоўнасцей ва ўяўленні большасці людзей змяняюць знак плюс на знак мінус, калі этнічная і рэлігійная ідэнтыфікацыя асобы пачынае набываць прыярытэтнае значэнне, істотна пашыраюцца магчымасці ўплыву культуры на сацыялізацыю.

Але, каб адзначыць найбольш эфектыўныя шляхі гэтага ўплыву, неабходна ўлічваць дынамічныя змяненні канфігурацыі пазітыўных і негатыўных ідэнтыфікацый, якія адбываюцца ў нашым грамадстве. Першая з пазітыўных ідэнтыфікацый заключаецца ў тым, што пад уплывам дэмакратызацыі ўсіх бакоў грамадскага жыцця адбываюцца сацыяльна-палітычнае разняволенне чалавека, вызваленне яго ад папярэдніх ідэалагізаваных штампаў, ацэнак, суджэнняў, арыентацый. Характэрна, што такое разняволенне больш выразна і маштабна адлюстроўваецца ў самасвядомасці і жыццёвых пазіцыях (уключаючы адносіны да дзяржаўнасці, культуры, рэлігіі, маралі) прасунутых у сацыяльным асяроддзі груп (прадпрымальнікі, менеджэры, выкладчыкі ВНУ, навуковыя супрацоўнікі і інш.), з аднаго боку,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і больш маладых узроставых кагорт, з другога. Возьмем для прыкладу такую актуальную для грамадства праблему, як суверэнітэт. Сярод маладых людзей ва ўзросце да 30 год колькасць паслядоўных прыхільнікаў суверэнітэту Беларусі складае 45,1% ад агульнай колькасці рэспандэнтаў (апытанне 1996г.), паслядоўных праціўнікаў яго — удвая менш (20,3%), тых, якія не адзначылі сваю пазіцыю, але схільныя да прызнання вялікай значнасці суверэнітэту, — 23,3%. Ва ўзроставай кагорце ад 50 гадоў і вышэй карціна супрацьлеглая: паслядоўныя прыхільнікі суверэнітэту складаюць толькі 18,2%, паслядоўныя праціўнікі — ў 2,6 раза больш (47,3%), а прамежкавая група складае 37,7% ад агульнай колькасці апытаных.

Другая пазітыўная тэндэнцыя ў сацыякультурнай ідэнтыфікацыі выражаецца ў вызваленні хуткімі тэмпамі шырокіх слаёў насельніцтва Беларусі ад патэрналісцкіх ілюзій і пераходзе іх на пазіцыі самастойнага сацыяльнага дзеяння. На працягу трох апошніх гадоў (1993-1996) колькасць людзей, якія пазбавіліся папярэдніх патэрналісцкіх уяўленняў і якія разлічваюць на асабістую самасвядомасць і асабістую сацыяльную актыўнасць, узрасла з 41,6% да 54,5%. Гэта значыць, перавысіла палову насельніцтва рэспублікі.

Трэцяя пазітыўная ідэнтыфікацыйная тэндэнцыя заключаецца ў тым, што няўхільна павялічваецца доля дарослага насельніцтва, якое пераходзіць да рынкавага - прадпрымальніцкіх формаў мыслення і дзейнасці. Цвёрда арыентаваныя на прадпрымальнасць, яны могуць рызыкаваць, праяўляць ініцыятыву. Гэтыя людзі схільныя да тых ці іншых відаў інавацыйнай дзейнасці, у тым ліку і ў сферы прадпрымальніцтва, 45,7% рэспандэнтаў, а характарызуюцца больш ці менш выразнай схільнасцю да такой дзейнасці яшчэ амаль 30% рэспандэнтаў. Тут зноў больш глыбокія ідэнтыфікацыйныя зрухі адбываюцца ў самасвядомасці і жыццёвых арыентацыях маладых

людзей у параўнанні з людзьмі сталага ўзросту і ў мужчын у параўнанні з жанчынамі.

Супярэчлівасць у сацыякультурных падставах трансфармацыйных працэсаў і звязаных з імі асаблівасцях сацыялізацыі асобы праяўляецца ў тым, што пазітыўныя ідэнтыфікацыі перасякаюцца з негатыўнымі. Першая і найбольш дэструктыўная з іх заключаецца ў буйнамаштабным разгортванні працэсаў аноміі, г.зн.не адзінакавага, якое ўсё больш распаўсюджваецца, а масавага парушэння прававых, маральных і іншых нормаў, што суправаджаецца беспарадкамі, сеяннем смуты і няўпэўненасці. Такі стан у грамадстве пазбаўляе людзей сацыяльнай салідарнасці, пачуцця сувязі з былой для іх «сваёй» супольнасцю, падштурхоўвае да розных формаў дэпрывацыі і дэвіяцыі. У выніку ствараецца інстытуцыяльны хаос, асоба выпадае з сістэмы сацыяльных каардынат, якая раней існавала.

Скажам, інтэлігенту ў адпаведнасці з яго сацыяльным статусам трэба знайсці сваё месца ў асяроддзі ідэнтычных яму прадуцэнтаў з такой сацыяльнай атрыбутыкай, як высокі ўзровень ведаў, рэфлексія, творчасць, інавацыя, абвостранае пачуццё сацыяльнай справядлівасці. Аднак гэтыя сацыяльныя стандарты, якія належаць нармальна развітаму грамадству, ва ўмовах глыбокага сацыяльна-эканамічнага крызісу разбураюцца, вымываюцца са свядомасці і паводзін прадстаўнікоў інтэлектуальнай працы па прычыне неспрыяльных жыццёвых умоў, якія прымушаюць апускацца на сацыяльнае дно. А ці можа быць інакш, калі ў першым квартале 1996г. сярэдняя заработная плата ў Беларусі складала: для работнікаў культуры толькі 70%, адукацыі — 79%, аховы здароўя — 82% да ўзроўню мінімальнага спажывецкага бюджэту? Сярод беспрацоўных трэцяя частка — асобы з дыпломамі спецыялістаў.

У выніку такіх трансфармацый ва ўзроўні жыццезабеспячэння для многіх прадстаўнікоў інтэлектуальнай працы адбыва-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ецца катастрафічнае змяненне бліжэйшага, раней роднага ім сацыяльнага асяроддзя, якое суправаджаецца негатыўным у сацыяльным сэнсе зрушэннем ў бок канформнасці і самапрыніжэння, якое ні да чаго іншага не вядзе, акрамя інтэлектуальнага люмпенства і маргіналізацыі. З прычыны гэтага ранейшая іерархія сацыякультурных нормаў і каштоўнасцей разбураецца, замяняецца новай, інкарпарыраванай звонку (беспрынцыповасць, прыстасавальніцтва, падмена сумлення прагай нажывы і інш.), зусім далёкай ад сацыяльнага статусу інтэлігента. Анамічны інтэлектуал становіцца духоўна стэрыльным, скептычна адносіцца да жыццёвых каштоўнасцей і пазіцый іншых, якія жывуць толькі імгненнымі ўражаннямі, без сувязі з мінулым і будучым. Ён востра негатыўна адчувае ўсю драматычнасць свайго статуснага відазмянення, яго духоўны свет раз'ядаецца ўзрастаючымі маштабамі інтэлектуальна-маральнай энтрапіі, а сам ён выходзіць за рамкі сацыялізіраванага кола блізкіх яму па духу суб'ектаў, выпадае з уласцівага яму сацыяльнага кантэксту. Сацыяльныя вынікі такой метамарфозы непрадказальныя, а калі вынесці яе за рамкі адной асобы і экстрапаліраваць на маштабы ўсёй сацыяльнай групы, гэта метамарфоза азначае дэструктыўную траекторыю сацыяльнага развіцця інтэлігенцыі як страты.

Другая істотная асаблівасць дзеяння сацыякультурных механізмаў сацыякультурнай трансфармацыі постсавецкага грамадства заключаецца ў тым, што ім шырока распаўсюджваюцца цудоўна прааналізаваныя ў працах Ф.Ніцшэ і М.Вебера з'явы рэсентыменту, г.зн. абвостранай нецярпімасці да ўсяго «іншага», у агрэсіўным адштурхоўванні ўсяго непрывычнага і чужога. У гэтым сацыяльна-дэструктыўным феномене эмацыянальныя ўсплёскі падаўляюць довады розуму і лагічныя аргументы, бязлітасна замяняючы іх гранічна абвостранымі, якія папярэднічалі перабудове, пачуццямі злобы, нянавісці і прагі помсты ў адносінах да каго б то ні было, абы ён з'яўляўся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

персаніфікаваным носьбітам «іншага». Гэта могуць быць багацце, нацыянальныя, рэлігійныя асаблівасці ці другі ўзровень культурнага развіцця. У выніку з'яўляецца мноства дэструктыўных для сацыялізацыі асобы парушэнняў нормаў маралі, права, этыкету і г.д.

Патрэбна ўлічваць і супярэчлівы ўплыў на сацыялізацыю асобы тых складаных змен у структуры каштоўнасцей, якія адбываюцца ў нашым грамадстве. Лангіцюдныя даследаванні, якія праводзяцца Інстытутам сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі Беларусі сумесна з расійскімі, украінскімі, эстонскімі калегамі і сацыёлагамі Стэнфардскага універсітэта (ЗША), паказалі, што абсалютная большасць выпускнікоў сярэдняй школы (93%) лічыла вышэйшай каштоўнасцю любімую,важную для грамадства працу. А ў цяперашні час, калі яны пасталелі на 15 гадоў, ужо арыентаваны, галоўным чынам, на матэрыяльны поспех і ўдачу (удалая жаніцьба, удалае замужжа, удалы кантракт і г.д.).Прыкладна такая ж арыентацыя і сённяшніх выпускнікоў школы і іх больш старэйшых равеснікаў вышэйшых навучальных устаноў.

Адначасова рэзка знізілася для моладзі, якая навучаецца ў школе і ВНУ, значнасць духоўна-маральных каштоўнасцей, добрай вучобы, авалодвання высокімі стандартамі культуры (змясціліся з 2-3-га рангавых месцаў у ерархіі арыентацый на 10-11-е месцы).

І ў такой пераарыентацыі нельга абвінавачваць моладзь, як гэта робяць некаторыя даследчыкі, таму што пераарыентацыя абумоўлена галоўным чынам, той сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй, у якой моладзь апынулася. Сёння 47.5% юнакоў і дзяўчат Беларусі не маюць магчымасці нармальна існаваць без падтрымкі бацькоў, а кожны пяты (у тым ліку выпускнікі ВНУ) цалкам залежаць ад бацькоў. Амаль палова маладых людзей (45%) выказваюць поўнае незадавальненне ступенню сваёй эканамічнай самастойнасці. Усё гэта патрабуе пераарыентацыі

выхавання моладзі, у тым ліку і сродкамі культуры, на фарміраванне ў яе сацыяльнай самастойнасці. Неабходна таксама стварэнне рэальных умоў для прыярытэтнага развіцця народнай адукацыі, навукі і культуры, узмацнення іх уплыву на істотнае ўзбагачэнне духоўнага жыцця, на стварэнне рэальных умоў выяўлення, падтрымкі і стымулявання развіцця таленавітай асобы. Таму ў рэфармуемай сістэме адукацыі акцэнт трэба рабіць на пошуку рэальных шляхоў пераадольвання аднабаковай сацыялізацыі і культуралізацыі асобы, якія панавалі ў нашай краіне з канца 20-х гадоў і амаль да апошняга часу, на вызначэнні аптымальных сродкаў выхаду з глыбейшага крызісу, галоўным чынам у галінах адукацыі і культуры.

Для гэтага неабходны наданне прыярытэтнасці развіццю апошніх, а таксама знаходжанне больш эфектыўных метадаў фарміравання новых сістэм духоўных каштоўнасцей, іх высакароднага ўплыву на духоўны свет і сацыяльныя ўстаноўкі фарміравання асобы. Вось тут і адкрываюцца шырокія, не існаваўшыя раней магчымасці ўзмацнення ролі і значнасці культуры, якая нясе ў сабе адзінства прыгажосці, ісціны і дабра, у сацыялізацыі асобы, у яе духоўным узвышэнні. Але для забеспячэння спрыяльных умоў патрэбна гарманізацыя нацыянальных і агульначалавечых культурных каштоўнасцей, якая можа быць дасягнута шляхам сумеснай распрацоўкі прадстаўнікамі культуралогіі, філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі дзейснага сцэнарыя развіцця нацыянальнай культуры ў кантэксце шырокай універсальнай асветы. Такая асвета арыентуе асобу на засваенне сусветных і нацыянальных каштоўнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ